**В. Р. Слівец**
(Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)

# УЛАСНЫЯ ІМЁНЫ Ў ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Анамастычныя адзінкі складаюць значную частку лексікі любой мовы, а ўласныя імёны розных тыпаў суправаджаюць нас на працягу жыцця, пранізваюць усе сферы дзейнасці, сустракаюцца ва ўсіх стылях маўлення. Тыпалогія ўласных імёнаў вельмі шырокая, на што не перастаюць уплываць стан і развіццё грамадства, ідэалагічныя, гістарычныя, эканамічныя і інш. фактары, у выніку чаго анамастычная лексіка пачынае выступаць адлюстраваннем гісторыка-культурнай спадчыны пэўнага соцыуму, народа, нацыі. Уласныя імёны валодаюць багатымі магчымасцямі для маўленчага развіцця, культурнай адукацыі, выхавання патрыятычных пачуццяў, цікавасці да нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Аднак у школьнай адукацыі вывучэнне ўласных імёнаў пераважна адбываецца ў адным аспекце – правапіс, а сам тэрмін і навука "анамастыка" гучаць даволі рэдка, нягледзячы на тое, што знаёмства з уласнымі імёнамі ў дзяцей адбываецца вельмі рана.

Усведамленне дзецьмі адметнасцей агульных і ўласных імёнаў – працэс паступовы і даволі складаны. Натуральна, што засваенне імі розніцы паміж прадметам і паняццем адбываецца не адразу. Так, на працягу перыяду ранняга ўзросту некаторыя словы (агульныя назоўнікі) дзіця выкарыстоўвае ў якасці ўласных, бо ў маўленні, звернутым да дзіцяці, звычайна акцэнтуецца менавіта прадметная, а не паняційная аднесенасць слова (дарослы чалавек амаль не гаворыць пра лялек увогуле, а часцей – пра адну канкрэтную ляльку). Разбірацца дзіцяці ў спецыфіцы агульных і ўласных назоўнікаў прыходзіцца самастойна, што зрабіць не так проста, таму і могуць узнікаць памылкі. Так, часта дзеці ў якасці агульных выкарыстоўваюць уласныя імёны (напрыклад, *Каця* – гэта не толькі сястра, але і ўсе дзяўчынкі такога ўзросту) [1, с. 62–63]. Пазней, "засвоіўшы факт двуіменнасці многіх дэнататаў" [1, с. 63] (наяўнасці агульнага і ўласнага імя ў аднаго прадмета), дзеці могуць пачаць "патрабаваць" іменавання для ўсіх навакольных прадметаў і жыццёвых рэалій.

У асноўную групу пачатковага лексікону дзіцяці (1–2 гады), у першую чаргу, уваходзяць тыя словы, што называюць блізкіх асоб – бацькі, дзядулі, бабулі. Але гэтыя тэрміны сваяцтва найчасцей ужываюцца ў сям'і без уласнага імені, акрамя тых выпадкаў, напрыклад, калі дыферэнцуюцца пэўныя родзічы (бабуля *Таня* і бабуля *Галя*). Братоў і сясцёр, наадварот, звычайна называюць па імені. Такім чынам, першаснае ўяўленне пра ўласнае імя дзіця атрымлівае ў сям'і, ад сваіх бацькоў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Паводле “Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі”, у межах адукацыйнай галіны *“Дзіця і грамадства”* ў напрамку *“Сацыяльна-маральнае і асобаснае развіццё выхаванца”* прадугледжана фарміраванне ў дзяцей *“імкнення да самапазнання, пазітыўных адносін да сябе, дарослых і аднагодкаў”*; *“першапачатковых уяўленняў пра свет і родны край”*, а гэта значыць – выхаванне патрыятычных пачуццяў, далучэнне да нацыянальных культурных традыцый, агульначалавечых каштоўнасцей і г. д. [2, с. 7]. Вялікі патэнцыял у гэтых адносінах мае анамастычная лексіка засваенне якой адбываецца паступова.

Так, пасля аднаго года і 6 месяцаў дзеці пачынаюць адгуквацца на сваё імя, што з’яўляецца адной з прыступак да самапазнання, фарміравання ўласнага вобраза “Я”, успрымання сябе як суб’екта міжасобасных адносін. Далейшае пазнанне соцыуму ў дзяцей 2–3 гадоў адбываецца шляхам усведамлення сябе членамі сям’і, разумення роднасных сувязей. Дзеці названага ўзросту пачынаюць адрозніваць блізкіх і знаёмых людзей не толькі па знешнасці, але і па імені. Але ў гэтым магчымы пэўныя цяжкасці, бо адно і тое ж імя могуць мець зусім розныя людзі. Разабрацца ў такой праблеме дзецям, зразумела, павінны дапамагчы бацькі ці выхавацелі. У межах узаемадзеяння выхаванцаў другой малодшай групы з аднагодкамі і дарослымі таксама фарміруецца ўменне карыстацца памяншальна-ласкальнымі формамі імёнаў, што ў сваю чаргу садзейнічае развіццю маўлення дзіцяці, пашырэнню яго лексікону, камунікатыўных здольнасцей, а таксама адчуванню стылістычных адценняў такіх слоў (*Іван, Ваня, Ванечка, Ванюша*).

Ва ўзросце 4–5 гадоў дзеці ўжо ведаюць сваё прозвішча. Свядомае разуменне прызначэння прозвішча (а таксама імя па бацьку) складваецца крыху пазней – у старэйшай узроставай групе). Вельмі важна на гэтым этапе растлумачыць дзецям у даступнай для іх разумення форме, што побач з функцыямі намінацыі, ідэнтыфікацыі, дыферэнцыяцыі прозвішчы назапашваюць у сабе памяць пра паходжанне, гісторыю сям’і, рода, нясуць інфармацыю аб нацыянальнасці, таму карысная формай работы (ва ўзаемадзеянні ўстановы дашкольнай адукацыі, выхаванцаў і іх бацькоў) будзе складанне геніялагічнага дрэва, сямейнага радаводу. Менавіта з засваення такіх паняццяў і пачынаецца выхаванне ўласнай годнасці, паважлівых адносін да сваіх бацькоў.

Пачынаючы з другой малодшай групы, у дзяцей складваецца ўяўленне пра сваю малую радзіму – горад ці вёску, дзе яны нарадзіліся, жывуць, без чаго немагчыма выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці. Спачатку гэта элементарнае веданне назвы свайго населенага пункта, пазней – яго вуліц, асноўных тапанімічных аб’ектаў, выдатных мясцін. *“Для маленькага чалавека вельмі важна адчуваць сувязь са сваім домам, вуліцай, на якой стаіць дом, раёнам, у якім знаходзіцца яго дзіцячы сад, працуюць бацькі. Менавіта ад любові да сваёй малой радзімы залежыць фарміраванне ў далейшым нацыянальнай самасвядомасці як найвялікшай духоўнай каштоўнасці”* [3, с. 5]. Ужо ва ўзросце 4–5 гадоў неабходна данесці да дзяцей інфармацыю аб іх нацыянальнай прыналежнасці, што жывуць яны ў Беларусі, а сталіца нашай радзімы – горад Мінск. Паступова гэта інфармацыя павінна ўскладняцца, узбагачацца новымі фактамі з гісторыі роднага паселішча, рознымі версіямі ўзнікнення яго назвы, краязнаўчымі матэрыяламі. Заўсёды з цікавасцю дзеці слухаюць легенды і паданні, звязаныя з роднымі мясцінамі, аповеды пра людзей, якія ўславілі іх. Выхаванцы старэйшай групы, акрамя гэтага, павінны ведаць геаграфічнае размяшчэнне нашай рэспублікі, вылучаць яе сярод іншых краін свету. Важным момантам з’яўляецца веданне дзяржаўнай сімволікі, асноўных святочных датаў, культурных традыцый беларусаў. Усё гэта спрыяе выхаванню патрыятычных пачуццяў, любові, павагі і гонару да роднага краю, а таксама дае магчымасць абудзіць у дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасць да беларускіх культурных традыцый, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.

Такім чынам, анамастычная лексіка часта становіцца аб’ектам цікавасці дзяцей, бо рэдка хто застаецца абыякавым да свайго ўласнага імя, яго значэння, гісторыі паходжання прозвішча, назвы свайго роднага горада (вёскі). Задача бацькоў і выхавацеляў – даць магчымасць “загаварыць” імёнам і правільна скіраваць дзіця ў далейшых пошуках, каб выхаваць іх чуйнымі да слова і прагнымі да ведаў.

Уласныя імёны валодаюць багатым пазнавальным, патрыятычным, гісторыка-культурным, эстэтычным патэнцыялам, развіваюць лексікон і камунікатыўныя здольнасці дзяцей, што паспяхова можна выкарыстоўваць у рэалізацыі зместу разнастайных дыдактычных

МГПУ им. И.П.Шамякина

адзінак (адукацыйныя напрамкі “Дзіця і грамадства”, “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”, “Мастацтва”), якія ўваходзяць у базавы кампанент “Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі”.

**Літаратура**

1. Цейтлин, С. Н. Язык и ребёнок: Лингвистика детской речи / С. Н. Цейтлин. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2000. – 240 с.

2. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі. – 2012. – 408 с.

3. Мой родны кут...: зб. метадычных матэрыялаў па патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту: у 2 ч. Ч. 2 / склад. В. В. Мініна. – Мазыр: ТАА ВД – “Белы Вецер”, 2009. – 155 с.

4. Шмелева, Т. В. Детская ономастика / Т. В. Шмелева // Начальная школа. – 2007. − № 5. – С. 90–95.

МГПУ им. И.П.Шамякина